## XI СЕСІЯ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН

# *Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР*

# *К. В. КІСЯЛЁВА*

### *на пленарным пасяджэнні XI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па егіпецкаму пытанню 18 студзеня 1957 г.*

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Пан старшыня,
Панове дэлегаты,

Дэлегацыя Беларускай ССР уважліва вывучыла мемарандум генеральнага сакратара ААН пана Хамаршэльда аб выкананні раней прынятых рэзалюцый Генеральнай Асамблеі, якія прадугледжваюць вывад англійскіх, французскіх і ізраільскіх войск з егіпецкай тэрыторыі. Генеральны сакратар інфармуе нас аб тым, што англійскія і французскія войскі ўжо выведзены з тэрыторыі Егіпта ў той час, як ізраільскія войскі толькі збіраюцца эвакуіраваць Сінайскую пустыню і адмаўляюцца эвакуіраваць раён Шарм Эль-Шайх, размешчаны на заходнім узбярэжжы заліва Акаба. Да гэтага часу генеральнаму сакратару невядомы таксама намеры ізраільскага ўрада адносна выканання рэзалюцый аб вывадзе ізраільскіх войск з раёна Газы. Міністр замежных спраў Егіпта пан Фаўзі ў сваім пісьме на імя генеральнага сакратара ААН ад 11 студзеня 1957 года паведамляе, што ўрад Ізраіля не выконвае рэзалюцый Генеральнай Асамблеі аб вывадзе сваіх войск з усёй тэрыторыі не справакаваныя акты ўзброенай агрэсіі з боку Ізраіля трэба разглядаць як яўнае парушэнне норм міжнароднага права і абавязацельстваў, што вынікаюць са Статута ААН.

Урад Ізраіля ў сваёй дэкларацыі ад 8 лістапада 1956 года заявіў, што ён гатоў «вывесці свае войскі з Егіпта». Наша дэлегацыя лічыць, што ў адпаведнасці з ранней прынятымі рэзалюцыямі Генеральнай Асамблеі ізраільскія войскі ўжо даўно павінны былі быць выведзены з тэрыторыі Егіпта. Некаторыя факты, аднак, сведчаць аб тым, што правячыя колы Ізраіля гатовы хутчэй развязаць новую вайну супраць Егіпта, чым вывесці свае войскі з егіпецкай тэрыторыі. Як паведаміў карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс 2 студзеня 1957 года, міністр сацыяльнага забеспячэння і культаў Ізраіля Шапіра заявіў, што Ізраіль лічыць за лепшае новую гарачую вайну, чым вывад сваіх войск з раёна Газы. Ён сказаў далей, што ізраільскі ўрад адновіць баі, калі яго войскам будзе загадана выйсці з раёна Газы. Генеральная Асамблея павінна асудзіць

Пан старшыня!

У сваіх выступленнях прадстаўнікі ЗША, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Канады, Англіі і іншыя рэкамендавалі, каб пасля вываду ізраільскіх узброеных сіл з егіпецкай тэрыторыі ў раён Газы і Шарм Эль-Шэйха, размешчанага ў заходнім узбярэжжы Акабскага заліва, былі ўведзены войскі ААН для таго, каб раздзяліць узброеныя сілы Егіпта і Ізраіля.

Мяркуючы па гэтых выступленнях і паведамленнях амерыканскай прэсы, прадугледжваецца акупацыя раёна Газы і Акабскага заліва ўзброенымі сіламі ААН. Прыняцце такой прапановы заходніх краін па сутнасці справы азначала-б, што Егіпту не будзе вернута яго ўласная тэрыторыя ў раёне Газы і на ўзбярэжжы Акабскага заліва.

Гэтая думка цалкам пацвярджаецца выступленнямі прадстаўнікоў Новай Зеландыі і Канады, якія па сутнасці прапанавалі, каб войскі ААН займалі гэтыя раёны да поўнага ўрэгулявання ўсёй палесцінскай праблемы. Такім чынам, робіцца спроба замяніць папярэднюю акупацыю

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы